**МІНІСТРЭСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Установа адукацыі
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
С.П.Рубніковіч
27.06.2023
Рег. № ВД-091-01/2324/вуч.

Контрольный экземпляр

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА

**Вучэбная праграма ўстановы адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

**7-07-0911-01 «Лячэбная справа»;**
**7-07-0911-02 «Медыка-прафілактычная справа»;**
**7-07-0911-03 «Стаматалогія»;**
**7-07-0911-06 «Педыятрыя»;**
**7-07-0912-01 «Фармацыя»**

2023

Вучэбная праграма распрацавана ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях 7-07-0911-01 "Лячэбная справа", 7-07-0911-02 "Медыка-прафілактычная справа", 7-07-0911-03 "Стаматалогія", 7-07-0911-06 "Педыятрыя", 7-07-0912-01 "Фармацыя", зацверджанымі і ўведзенымі ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 01.09.2023 № 302/127; вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-01 "Лячэбная справа", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-01/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-02 "Медыка-прафілактычная справа", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-02/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-03 "Стаматалогія", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-03/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0911-06 "Педыятрыя", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0911-06/2324, вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці 7-07-0912-01 "Фармацыя", зацверджаным 27.06.2023, рэгістрацыйны № 7-07-0912-01/2324.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Т. М. Мельнікава, загадчык кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

А. А. Носік, старшы выкладчык кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.П.Пусташыла, загадчык кафедры рускай і беларуская моў установы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Кафедра замежных моў установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт».

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**

Кафедрай беларускай і рускай моў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
(пратакол № 10 ад 18.05.2023).

Навукова-метадычным саветам гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
(пратакол № 6 ад 27.06.2023).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

“Беларуская мова: прафесійная лексіка” – вучэбная дысцыпліна, задача якой – далучыць студэнтаў да багаццяў нацыянальнай культуры, сфарміраваць камунікатыўна развітую асобу, здольную наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай сферы, перакладаць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя і навуковыя тэксты, весці дзелавую дакументацыю, выступаць з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі.

Мэты вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова: прафесійная лексіка”:

пашыраць і ўзбагачаць прафесійны лексічны запас будучых спецыялістаў,

выпрацоўваць і замацоўваць практычныя ўменні і навыкі правільнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай у вуснай мове і на пісьме;

развіваць моўна-эстэтычны густ студэнтаў, звязаны з чысцінёй і правільнасцю мовы;

фарміраваць установкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

выхоўваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі, імкнення да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы.

Задачы вывучэння дысцыпліны:

сфарміраваць у студэнтаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;

даць студэнтам неабходную сістэму ведаў аб лексічным складзе, тэрміналогіі і маўленчай культуры;

дапамагчы студэнтам усвядоміць месца беларускай мовы ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі;

садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага двухмоўя.

Студэнт, які засвоіў змест навучальнага матэрыялу вучэбнай дысцыпліны, павінен валодаць наступнай універсальнай кампетэнцыяй:

УК. Ажыццяўляць камунікацыю на беларускай або замежнай мове для вырашэння задач міжасобаснага і прафесійнага ўзаемадзеяння.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;

функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры;

месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў;

сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы;

поўны набор прафесійнай лексікі;

тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці;

**умець:**

граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай;

адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю;

перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты;

складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публіцыстычныя выступленні і г.д.;

выконваць тэсты і тэставыя заданні, якія садзейнічаюць замацаванню вучэбнага матэрыялу;

**валодаць:**

прынцыпамі фарміравання і пераказу прафесійных і агульнаўжывальных тэкстаў на беларускай мове;

афармленнем медыцынскай дакументацыі на беларускай мове;

сістэмай ведаў пра фанетычныя, лексічныя і граматычныя асаблівасці сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

сучаснымі нормамі беларускага правапісу;

вуснай і пісьмовай формамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў сферах прафесійнай і грамадскай дзейнасці.

У рамках адукацыйнага працэсу па беларускай мове студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя веды, практычныя ўменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбной дысцыпліны адводзіцца 54[1]/64[2]/72[3] акадэмічных гадзін. Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 34 гадзіны практычных заняткаў, 20[1]/30[2]/38[3] гадзін самастойнай працы студэнта.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з навучальным планам па спецыяльнасці ў форме заліку.

Форма атрымання адукацыі – вочная дзённая / завочная.

---

[1] Для спецыяльнасцей 7-07-0911-01 “Лячэбная справа”, 7-07-0911-02 “Медыка-прафілактычная справа”, 7-07-0911-03 “Стаматалогія”.

[2] Для спецыяльнасці 7-07-0911-06 “Педыятрыя”.

[3] Для спецыяльнасці 7-07-0912-01 “Фармацыя”.

# РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЭТУ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ ПА СЕМЕСТРАХ

| Код, назва спецыяльнасці | Семестр | Колькасць гадзін вучэбных заняткаў | | | | Форма бягучай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | аўдыторных | з іх | самастойных пазааўдыторных | |
| | | | | практычных заняткаў | | |
| 7-07-0911-01 “Лячэбная справа” | 1 | 54 | 34 | 34 | 20 | залік |
| 7-07-0911-06 “Педыятрыя” | 1 | 64 | 34 | 34 | 30 | залік |
| 7-07-0911-02 “Медыка-прафілактычная справа” | 3 | 54 | 34 | 34 | 20 | залік |
| 7-07-0911-03 “Стаматалогія” | 2 | 54 | 34 | 34 | 20 | залік |
| 7-07-0912-01 “Фармацыя” (вочная дзённая форма навучання) | 1 | 72 | 34 | 34 | 38 | залік |
| 7-07-0912-01 “Фармацыя” (завочная форма навучання) | 2 | 36 | 4 | 4 | 32 | |
| | 3 | 36 | 4 | 4 | 32 | залік |

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
## (ВОЧНАЯ ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Назва раздзела (тэмы) | Колькасць гадзін аўдыторных практычных заняткаў |
|---|---|
| **1. Нацыянальная мова і формы яе існавання** | **4** |
| 1.1 Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы | 2 |
| 1.2 Сучасная літаратурная мова і яе кадыфікацыя | 2 |
| **2. Асаблівасці навуковага стылю** | **2** |
| **3. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы** | **2** |
| **4. Беларуская навуковая тэрміналогія** | **2** |
| **5. Беларуская медыцынская тэрміналогія: гісторыя станаўлення, крыніцы і сучасны стан. Фармацэўтычная тэрміналогія** | **20** |
| **6. Культура мовы і медыцына** | **4** |
| 6.1. Маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне. Тыповыя маўленчыя памылкі | 2 |
| 6.2. Медыцынская і агульначалавечая мараль у творах беларускіх пісьменнікаў | 2 |
| **Усяго гадзін** | **34** |

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
## (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Назва раздзела (тэмы) | Колькасць гадзін аўдыторных практычных заняткаў | Самастойная работа |
|---|---|---|
| **1. Нацыянальная мова і формы яе існавання** | **2** | **8** |
| 1.1 Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы. | 1 | 4 |
| 1.2 Сучасная літаратурная мова і яе кадыфікацыя. | 1 | 4 |
| **2. Асаблівасці навуковага стылю** | | **8** |
| **3. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы** | | **4** |
| **4. Беларуская навуковая тэрміналогія** | **2** | **8** |
| **5. Беларуская медыцынская тэрміналогія: гісторыя станаўлення, крыніцы і сучасны стан. Фармацэўтычная тэрміналогія** | **4** | **34** |
| **6. Культура мовы і медыцына** | | **10** |
| 6.1 Маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне. Тыповыя маўленчыя памылкі | | 2 |
| 6. 2 Медыцынская і агульначалавечая мараль у творах беларускіх пісьменнікаў | | 8 |
| **Усяго гадзін** | **8** | **72** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. Нацыянальная мова і формы яе існавання

### 1.1. Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы

Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Мова і міждысцыплінарныя сувязі. Месца нацыянальнай мовы ў сістэме гуманітарных навук. Нацыянальная мова – крыніца духоўнай і інтэлектуальнай культуры беларусаў. Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму.

### 1.2. Сучасная літаратурная мова і яе кадыфікацыя

Кадыфікацыя сучаснай літаратурнай мовы. Нормы літаратурнай мовы, яе тыпы. Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы: гутарковы, навуковы, публіцыстычны, мастацкі, афіцыйна-справавы. Асноўныя віды жанраў і тэкстаў гэтых стыляў, сфера іх выкарыстання.

### 2. Асаблівасці навуковага стылю

Функцыянальна-камунікатыўныя характарыстыкі (аб'ектыўнасць, лагічнасць, яснасць, дакладнасць, доказнасць) і сістэма моўных сродкаў (агульнанавуковая, тэрміналагічная лексіка; сродкі лагічнай сувязі) навуковага стылю.

Марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковага стылю. Кампазіцыйна-структурная арганізацыя навуковых тэкстаў. Жанры навуковай літаратуры (анатацыя, рэзюме, рэферат, тэзісы, даклад, артыкул).

**3. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы**

Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі.

**4. Беларуская навуковая тэрміналогія**

Паняцце тэрміна. Слова і словазлучэнне ў ролі тэрміна. Тэрміналогія. Галіновыя тэрміналагічныя сістэмы. Узаемасувязь тэрміналагічнай і агульнаўжывальнай лексікі (тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя). Асаблівасці словаўтварэння беларускай тэрміналогіі (прадуктыўныя спосабы і сродкі). Тэрміны, запазычаныя з іншых моў, іх асваенне беларускай мовай.

З гісторыі беларускай навуковай тэрміналогіі. Асноўныя прынцыпы яе выпрацоўкі ў 20-30-я гг. XX ст. Крыніцы фарміравання беларускай тэрміналогіі. Роля жывой народнай мовы ў складванні і развіцці беларускай тэрміналагічный лексікі. Беларуская навуковая тэрміналогія на сучасным этапе.

**5. Беларуская медыцынская тэрміналогія: гісторыя станаўлення, крыніцы і сучасны стан**

Дзейнасць Беларускай навукова-тэрміналагічнай камісіі ў 20-х гг. XX стагоддзя і яе набыткі ў галіне медыцыны.

Два накірункі ў развіцці анатамічнай тэрміналогіі: утварэнне тэрмінаў на аснове беларускай размоўнай лексікі і на аснове грэчаска-лацінскіх тэрмінаэлементаў праз іх адаптацыю да фанетычных і граматычных нормаў беларускай мовы. Утварэнне тэрмінаў на аснове беларускамоўнай лексікі.

Утварэнне тэрмінаў на аснове грэчаска-лацінскіх тэрмінаэлементаў.

Аднаслоўныя клінічныя тэрміны. Каранёвыя і канцавыя тэрмінаэлементы і іх значэнне.

Шматслоўныя клінічныя тэрміны, іх структура і лексічны склад.

Складаныя клінічныя тэрміны грэчаскага паходжання. Эпанімічныя клінічныя тэрміны.

Тэрміны і назвы медыка-біялагачных навук, спецыяльнасцей, раздзелаў клінічнай медыцыны. Назвы спецыялістаў у медыка-біялагічных навуках і ў клінічнай медыцыне.

Назвы метадаў абследавання і метадаў лячэння.

Асаблівасці перакладу навуковых тэрмінаў (медыцынскіх).

**6. Культура мовы і медыцына**

**6.1. Маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне. Тыповыя маўленчыя памылкі**

Маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне. Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення. Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўныя якасці-паказчыкі паспяховага выступлення. Маўленчы этыкет і культура зносін

**6.2. Медыцынская і агульначалавечая мараль у творах беларускіх пісьменнікаў**

Медыцынская і агульначалавечая мараль у творах беларускіх пісьменнікаў. Выкарыстанне медыцынскіх тэрмінаў у мастацкіх творах.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА”

### (ДЛЯ ВОЧНАЙ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ)

| Код раздзела | Назва раздзела, тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць гадзін | Самастойная работа студэнта | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | семінарскіх заняткаў | | |
| **1.** | **Нацыянальная мова і формы яе існавання** | **4** | - | - |
| 1.1 | Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы | 2 | - | вуснае апытванне |
| 1.2 | Сучасная літаратурная мова і яе кадыфікацыя | 2 | 5 | вуснае апытванне; пісьмовыя практыкаванні; электронныя тэсты |
| **2.** | **Асаблівасці навуковага стылю** | **2** | - | пісьмовыя практыкаванні |
| **3.** | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы** | **2** | 5 | пісьмовыя практыкаванні; |
| **4.** | **Беларуская навуковая тэрміналогія** | **2** | - | вуснае апытванне; кантрольнае апытванне |
| **5.** | **Беларуская медыцынская тэрміналогія: гісторыя станаўлення, крыніцы і сучасны стан. Фармацэўтычная тэрміналогія** | **20** | - | |
| | Дзейнасць навукова-тэрміналагічнай камісіі ў 20-я гг. ХХ стагоддзя і яе дасягненні ў галіне медыцыны | 2 | - | вуснае апытванне; электронныя тэсты |
| | Два накірункі ў развіцці анатамічнай тэрміналогіі | 2 | - | вуснае апытванне; пісьмовыя практыкаванні |
| | Утварэнне тэрмінаў на аснове беларускай размоўнай лексікі і на аснове грэчаска-лацінскіх тэрмінаэлементаў праз іх адаптацыю да фанетычных і граматычных нормаў беларускай мовы | 2 | - | пісьмовыя практыкаванні; электронныя тэсты |
| | Аднаслоўныя і шматслоўныя клінічныя тэрміны | 2 | - | пісьмовыя практыкаванні; электронныя тэсты |

| Код раздзела | Назва раздзела, тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць гадзін семінарскіх заняткаў | Самастойная работа студэнта | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | Каранёвыя і канцавыя тэрмінаэлементы і іх значэнне | 2 | - | пісьмовыя практыкаванні |
| | Тэрміны і назвы медыка-біялагачных навук, спецыяльнасцей, раздзелаў клінічнай медыцыны | 2 | - | пісьмовыя практыкаванні |
| | Назвы спецыялістаў у медыка-біялагічных навуках і ў клінічнай медыцыне | 2 | - | пераклад |
| | Назвы метадаў абследавання і метадаў лячэння | 2 | - | пісьмовыя практыкаванні |
| | Шматслоўныя клінічныя тэрміны, іх структура і лексічны склад. Эпанімічныя клінічныя тэрміны. | 2 | - | пісьмовыя практыкаванні; электронныя тэсты |
| | Кантрольны пераклад навуковага тэксту медыцынскай тэматыкі з дадатковымі заданнямі. | 2 | - | кантрольная работа |
| **6.** | **Культура мовы і медыцына** | **4** | - | - |
| 6.1 | Маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне. Тыповыя маўленчыя памылкі | 2 | 5 | рэферыраванне; даклады на практычных занятках |
| 6.2 | Медыцынская і агульначалавечая мараль у творах беларускіх пісьменнікаў | 2 | 15 | рэферыраванне; залік |
| | **Усяго гадзін** | **34** | **30** | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА”
### (ДЛЯ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ)

| Код раздзела | Назва раздзела, тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць гадзін семінарскіх заняткаў | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | **2 семестр** | | |
| **1.** | **Нацыянальная мова і формы яе існавання** | **2** | - |
| 1.1.<br>1.2. | Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы. Сучасная літаратурная мова і яе кадыфікацыя. | 2 | Вуснае апытванне; электронныя тэсты |
| **2.** | **Беларуская навуковая тэрміналогія** | **2** | Кантрольная работа |
| **3 семестр** | | | |
| **5.** | **Беларуская медыцынская тэрміналогія: гісторыя станаўлення, крыніцы і сучасны стан. Фармацэўтычная тэрміналогія** | **4** | **-** |
| | Беларуская медыцынская тэрміналогія: гісторыя станаўлення, крыніцы і сучасны стан. Два накірункі ў развіцці анатамічнай тэрміналогіі. Аднаслоўныя і шматслоўныя клінічныя тэрміны | 2 | Вуснае апытванне; пісьмовыя практыкаванні; электронныя тэсты |
| | Фармацэўтычная тэрміналогія. Лекавыя формы, рэчывы, сродкі, прэпараты | 2 | Залік |
| | **Усяго гадзін** | **8** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


**Асноўная:**

1. Беларуская мова : прафесійная лексіка (для спецыяльнасцей медыка-біялагічнага профілю) : вучэбна-метадычны дапаможнік / Н.У. Чайка [і інш.]. – Мінск : БДМУ, 2020. – 103 с.

2. *Носік, А.А.* Беларуская мова : стаматалагічная тэрміналогія : вучэбна-метадычны дапаможнік / А.А.Носік, Н.В. Ратынская, Н.У. Чайка. Мінск : БДМУ, 2020. – 106 с.

**Дадатковая:**

3. Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Сацыяльна-гуманітарныя навукі: вучэб. дапам. / М. Р. Прыгодзіч [і інш.]; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. І. Куліковіча. – Мінск: РІВШ, 2015. – 260 с.

4. *Кітаева, Т.В.* Беларуская мова. Прафесійная лексіка / Т.В. Кітаева, Н.В. Ратынская. – Мінск, БДМУ, 2015.

**Слоўнікі:**

5. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы для школьнікаў: новыя правілы беларускага правапісу / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Современная школа, 2010. – 256 с.

6. Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад: Л.П. Кунцэвіч, І.У. Кандраценя; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 695 с.

7. *Варанец, В. І.* Руска-беларускі тлумачальны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў: для супрацоўнікаў сферы аховы здароўя, студэнтаў медыцынскіх установаў вышэйшай і сярэдняй адукацыі / В. І. Варанец. – Мінск, 2013. – 208 с.

8. *Кандраценя, І. У.* Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандраценя / пад рэд. А. А. Лукашанца. – 3-е выд., выпр. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – 695 с.

9. *Клундук, С.С.* Беларуская мова: усе складаныя тэмы: тэорыя і практыкаванні / С.С. Клундук, Н.Р. Якубук. – Мінск : Аверсэв, 2010. – 112 с.

10. *Лапкоўская, А. М.* Сучасная беларуская батанічная тэрміналогія / А. М. Лапкоўская. – Гродна, 2007.

11. *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы. Т. 1. А-Л / І. Я. Лепешаў.– Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2008. – 672 с.

12. *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы. Т. 2. М-Я / І. Я. Лепешаў.– Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2008. – 704 с.


## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПА НАВУЧАЛЬНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

Час, адведзены на самастойную працу, можа выкарыстоўвацца навучэнцамі на:

падрыхтоўку да практычных заняткаў;

падрыхтоўку да заліку па вучэбнай дысцыпліне;

вывучэнне тэм (пытанняў), вынесеных на самастойнае вывучэнне;

выкананне даследчых і творчых заданняў;

падрыхтоўку тэматычных дакладаў, рэфератаў, прэзентацый;

выкананне практычных заданняў;

канспектаванне навучальнай літаратуры;

складанне агляду навуковай літаратуры па зададзенай тэме;

афармленне інфармацыйных і дэманстрацыйных матэрыялаў (стэнды, плакаты, графікі, табліцы, газеты і інш.).

**ПЕРАЛІК СРОДКАЎ,ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ДЛЯ ДЫЯГНОСТЫКІ**

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

Вусная форма:

вуснае апытванне;

даклады на практычных занятках;

даклады на канферэнцыях.

Пісьмовая форма:

тэсты;

пераклад;

пісьмовыя практыкаванні;

кантрольныя тэсты;

кантрольнае апытванне;

кантрольная работа.

Вусна-пісьмовая форма:

рэферыраванне;

залік.

## ВЫКАРЫСТАНЫЯ МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

Лінейны (традыцыйны) метад (лекцыя, практычныя і семінарскія заняткі);

актыўныя (інтэрактыўныя) метады:

навукова-арыентаванае навучанне RBL (Research-Based Learning).

дзелавая гульня (Serious Play, Serious Game);

інтэрв'ю (Interview);

прагляд і абмеркаванне навучальных відэафільмаў (Film-Based Learning)$

публічная прэзентацыя (Public Presentation);

работа ў малых групах (Small Group Workshop);

сакратычны дыялог (Socratic Dialogue).

## ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ НАВЫКАЎ:

1. Здольнасць акрэсліць месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў.
2. Веданне і выкарыстанне поўнага набору прафесійнай лексікі.
3. Уменне складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публіцыстычныя выступленні.
4. Афармленне медыцынскай дакументацыі на беларускай мове.
5. Валоданне вуснай і пісьмовай формамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў сферах прафесійнай і грамадскай дзейнасці.

**Складальнікі:**

Загадчык кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» Т. М. Мельнікава

Старшы выкладчык кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» А. А. Носік

Змест, афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных дакументаў адпавядае ўстаноўленым патрабаванням:

Дэкан лячэбнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» А.І.Валатоўскі
27.06 2023

Дэкан педыятрычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» А.К.Філіповіч
27.06 2023

Дэкан медыка-прафілактычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» А.У.Гіндзюк
27.06 2023

Дэкан стаматалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» Т.Л.Шавела
27.06 2023

Дэкан фармацэўтычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» Н.С.Гурына
27.06 2023

Метадыст аддзела навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» С.А.Янковіч
27.06 2023